**18.** Закончыце сказ: *Сёння чацвер, а заўтра будзе … .*

**А)** панядзелак. **Б)** аўторак. **В)** серада. **Г)** пятніца. **Д)** субота.

**19.** Якая літара прапушчана ў словах?

*1) Св..та; 2) вец..р; 3) м..тро.*

**А)** е. **Б)** я. **В)** ю. **Г)** ё. **Д)** і.

**20.** Як называецца кветка, у якой пялёсткі пахучыя, а сцяблінка калючая?



**А)** ландыш. **Б)** ружа. **В)** рамонак.
**Г)** канюшына. **Д)** дзівасіл.

**21.** Якога слова не хапае ў прыказцы?

*Чалавек без Радзімы, як салавей без … .*

**А)** гнязда. **Б)** ежы. **В)** сябра. **Г)** песні. **Д)** выраю.

**22.** Дадзены словы на рускай мове:

*1) клюв; 2) мел; 3) карандаш.*

Падбярыце адпаведнікі на беларускай мове:

*а) крэйда; б) аловак; в) дзюба.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в.
**Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

**23.** Выберыце з дадзеных назваў толькі імёны людзей.

*1) Мацвей; 2) Магілёў; 3) Міканор; 4) Мінск.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**24.** Прачытайце ўважліва народную загадку.

*Растае сняжок,*
*Ажывае лужок.*
*Дзень прыбывае.*
*Якая пара наступае?*

Вызначце адгадку, правільна паставіўшы пераблытаныя склады.

**А)** навяс. **Б)** мазі. **В)** сеньво. **Г)** тале. **Д)** лакзо.

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 14. Тыраж 4800 экз. Мінск. 2024 г.

# Конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2024»

*Чацвер, 22 лютага 2024 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 120, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 2 класа

**1.** Падлічыце, колькі слоў у скорагаворцы.

*Дудардударудармадудкудае.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**2.** Выберыце назвы школьных прылад.

*1) пенал; 2) акно; 3) сшытак; 4) дзверы.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**3.** Прачытайце ўважліва загадку:

*Белы, як снег, салодкі, як мёд.*

Знайдзіце ў пераблытаных літарах адгадку.

**А)** к, а, ц, а, ц. **Б)** а, р, у, к, ц. **В)** о, к, с.
**Г)** а, к, у, р, б. **Д)** б, у, ц, ы, л, я.

**4.** Прачытайце ўважліва імёны:

*1) Рыта; 2) Юра; 3) Барыс; 4) Ігнат.*

Якія імёны пачынаюцца з галоснай?

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**5.** Як стукае дзяцел па дрэве?

**А)** тук-тук-тук. **Б)** мяў-мяў-мяў. **В)** цілі-цілі-цілі.
**Г)** гаў-гаў-гаў. **Д)** му-му-му.

---

**6.** Суаднясіце назвы жывёл і малюнкі.

*1) зубр; 2) карова; 3) конь; 4) лось.*


*а)*

*б)*

*в)*

*г)*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в. **В)** 1-в, 2-а, 3-б, 4-г.
**Г)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а. **Д)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б.

---

**7.** Прачытайце ўважліва словы:

*1) лыжы; 2) туфлі; 3) шар; 4) воблака.*

Выберыце тыя з іх, якія маюць два склады.

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**8.** Якую расліну называюць “сябрам” таго, хто ідзе пешшу?

**А)** званочак. **Б)** зверабой. **В)** падарожнік.
**Г)** лотаць. **Д)** дзьмухавец.

---

**9.** Якія прыклады з прапанаваных з’яўляюцца назвай посуду?

*1) зацірка; 2) боршч; 3) лыжка; 4) відэлец.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---



**10.** Адгадайце загадку:

*На тоненькай ножцы стаіць,*
*Сонейкам на неба глядзіць.*

**А)** валошка. **Б)** званочак. **В)** сланечнік. **Г)** парасон. **Д)** грыб.

---

**11.** Колькі ў беларускай мове галосных гукаў?

**А)** 3. **Б)** 4. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**12.** Выберыце з дадзеных словы, якія напішаце з вялікай літары.

*1) (В, в)аля; 2) (І, і)ван; 3) (П, п)оле.*

**А)** усе дадзеныя словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2.
**Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**13.** Прачытайце ўважліва сказ:

*На катку, пакрытым тоўстым лёдам, зашумела дзетвара.*

Вызначце колькасць слоў, якія маюць дзве галосныя.

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**14.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску неабходна ўставіць літару ***ы***?

*1) м..шка; 2) гр..бы; 3) др..ва; 4) г..ра.*

**А)** у 1, 2. **Б)** у 1, 3. **В)** у 2, 3. **Г)** у 2, 4. **Д)** у 3, 4.

---

**15.** Прачытайце ўважліва рады слоў:

*1) паліто, сукенка, касцюм; 2) жыта, пшаніца, ячмень;*
*3) лебяда, асот, свірэпа.*

Якую агульную назву кожны рад слоў мае?

*а) пустазелле; б) адзенне; в) збожжа.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-в. **В)** 1-б, 2-в, 3-а.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**16.** Разгледзьце ўважліва малюнкі.







Назва якога малюнка з’яўляецца словам-адгадкай народнай загадкі?

*Невялікі, рыжаваты, а хвост доўгі і калматы, на дрэве жыве, шышкі грызе.*

**А)** малпа. **Б)** птушка. **В)** вавёрка. **Г)** сава. **Д)** рысь.

---

**17.** Як напісаць па-беларуску назву рыбы ***щука***?

**А)** плотка. **Б)** карась. **В)** мянтуз. **Г)** лешч. **Д)** шчупак.